практыкантаў працоўным інвентаром і вымяральнай апаратурай.

Асноўныя праблемы, якія ўзнікаюць на працягу археалагічнай практыкі, звязаны з яе агульным матэрыяльным забеспячэннем (транспартнымі паслугамі, аплатай працы навуковага кіраўніка і г.д.). Вырашэнне гэтых праблем магчыма толькі пры наяўнасці ва універсітэце добрай матэрыяльнай базы для правядзення вытворчай практыкі.

**А.А.Корбут,**
**ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## СУПЕРВІЗАРСТВА[1] ЯК ЧАСТКА ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ САЦЫЯЛЬНАГА РАБОТНІКА

Супервізарства з'яўляецца адным з атрыбутаў прафесіяналізму ў замежнай сацыяльнай рабоце. Гэта ўзровень тэхналогіі арганізацыі сацыяльнай работы, які ўключае падрыхтоўку сацыяльнага работніка, яго далейшы прафесійны рост, прафілактыку прафесійнай рызыкі.

Як вядома, сацыяльная работа прызнана адным са спецыфічных відаў прафесійнай дзейнасці з павышаным узроўнем псіхалагічнай нагрузкі. Сацыяльны работнік схільны да прафесійнай рызыкі, што прыводзіць яго да стрэсавых сітуацый. Сярод шматлікіх стрэсагенных фактараў у прафесійнай сацыяльнай рабоце можна назваць такія, як пастаянная павышаная эмацыянальная нагрузка, неабходнасць дзейнічаць у непрадказальнай сітуацыі, няўпэўненасць у канчатковым станоўчым выніку сваіх дзеянняў, павышаная адказнасць не толькі за свае, але і за дзеянні іншых і, нарэш-

[1] У перакладзе гэта слова азначае "нагляд". Аднак беларускае слова "нагляд" у сучасным сэнсавым варыянце не адпавядае зместу англійскага слова "supervision". Іншы раз гэта слова перакладаюць як "кантроль і назіранне ў сацыяльнай рабоце". Але кантроль і назіранне — гэта толькі частка прафесійнага супервізарства. Найбольш блізкім па змесце ў беларускай мове тэрміну "супервізар" з'яўляецца слова "настаўнік".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

це, пачуццё адчаю ад немагчымасці вырашыць тую ці іншую праблему свайго падапечнага.

Сацыяльны работнік, эмацыянальна знаходзячыся ў стане неспакою (перадстрэсавы стан), пачынае перажываць расчараванне ў рабоце, адчужасцца ад яе, адчувае сваю бездапаможнасць, глядзіць на сваю работу выключна з пазіцый песімізму. Такі работнік становіцца цынічным, яго адносіны да кліентаў набываюць жорсткасць і фармальнасць. Ён пастаянна адчувае фізічную стомленасць, галаўныя болі, бяссонніцу, схільны да прастудных захворванняў і інш.

Урач тут мала чым можа дапамагчы. У сям'і пачынаюцца праблемы, а калі блізкія і стараюцца дапамагчы, то гэта дапамога, як правіла, малаэфектыўная, наколькі яна вядзецца на бытавым узроўні. Можна было б звярнуцца да спецыяліста-псіхолага, які акажа канкрэтную эфектыўную дапамогу. Але псіхолаг можа не ведаць усёй спецыфікі сацыяльнай работы, усіх яе нюансаў, звязаных з сацыяльным асяроддзем сацыяльнага работніка.

Па-сапраўднаму прафілактычная работа, звязаная са стварэннем аптымальных умоў для эфектыўнай работы сацыяльных службаў, патрабуе не толькі падтрымкі сацыяльнага работніка, але і сістэмнай перадачы ведаў і ўменняў, пастаяннага павышэння кваліфікацыі прафесійнага сацыяльнага работніка.

Каб аказаць непасрэдную дапамогу практыкуючаму сацыяльнаму работніку, а ў выпадку неабходнасці і пракантраляваць яго дзейнасць, каб пастаянна стымуляваць работніка назапашваць веды, навыкі і ўменні, каб выслухаць уважліва, прафесійна і своечасова патушыць ці прадухіліць магчымыя зрывы, патрэбен асобага роду спецыяліст-супервізар.

Менавіта зараз у Рэспубліцы Беларусь, калі прафесія сацыяльнага работніка праходзіць стадыю станаўлення, неабходна сур'ёзна вывучыць гэты аспект замежнага вопыту і ўвесці інстытут супервізараў у арганізацыйную сістэму сацыяльнай работы ў рэспубліцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Відавочна, што прафесійны супервізар-настаўнік, які мае да гэтага схільнасці і атрымае адпаведную спецыяльную падрыхтоўку ў ВНУ, мог бы аказаць незаменную прафесійную дапамогу ў рабоце сацыяльных устаноў, калі б з'явілася такая пасада ў штатных раскладах тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнай абароны.

За мяжой асноўныя службовыя абавязкі такога работніка прадугледжваюць выразна акрэсленыя функцыі.

— Па-першае, ён павінен садзейнічаць павышэнню кваліфікацыі сацыяльнага работніка, узроўню яго ведаў, навыкаў і ўменняў. У гэтым выпадку размова ідзе аб адукацыйнай функцыі: навучаць засвойваць новыя веды, выкарыстоўваць вопыт і веды, інфармаваць, тлумачыць, накіроўваць, дапамагаць работніку знаходзіць правільнае рашэнне, калі ён звяртацца за дапамогай, даваць парады, кансультаваць, прапаноўваць новыя методыкі, тэхналогіі і інш.

— Па-другое, маецца на ўвазе падтрымліваючая функцыя; г.зн. асобасная падтрымка сацыяльнага работніка, спроба зняць ці зменшыць напружанне ад практычнай работы з людзьмі, маючымі шмат асабістых і сацыяльных праблем, уладжванне канфліктаў, калі яны ўзнікаюць пры рабоце з кліентамі ці калегамі па рабоце і, зразумела ж, прафілактыка стрэсаў і пошук дадатковых крыніц падтрымання жыццёвага тонусу сацыяльнага работніка.

— Па-трэцяе, кантрольная функцыя, якая часткова носіць адміністрацыйны характар, аднак патрэбная не толькі на пачатковым этапе станаўлення пафесіі, але і ў далейшым, на наступных этапах яе развіцця як неабходная ўмова для кантролю і гарантыі якасці сацыяльнага абслугоўвання.

Звычайна кола адміністрацыйных абавязкаў супервізара прадугледжвае наступнае:

— падбор і расстаноўку кадраў;
— планаванне сацыяльнай работы;
— падбор каманд;
— размеркаванне абавязкаў паміж членамі каманды;

— маніторынг, кантроль і ацэнку якасці работы сацыяльных работнікаў;

— каардынацыю работы паміж камандамі;

— арганізацыю "знешняй" сувязі каманд з іншымі арганізацыямі ці органамі ўлады і кіравання;

— супрацоўніцтва з іншымі супервізарамі;

— выкананне ролі "адміністрацыйнага буфера" (уладжванне канфліктаў паміж кліентамі і сацыяльным работнікам);

— абарону прафесійных інтарэсаў падапечных сацыяльных работнікаў (роля пасрэдніка паміж сацыяльным работнікам і кіраўніцтвам органаў сацыяльнага абслугоўвання).

Тэарэтычная і практычная аснова для здзяйснення гэтых задач маецца і ў Беларусі. Гэта — тэорыя і практыка кіраўніцкай дзейнасці, ці, як модна зараз называць, менеджменту.

За мяжой інстытут супервізараў развіты ў сістэме вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі ў галіне сацыяльнай работы. Як вядома, большая частка падрыхтоўкі спецыялістаў прыпадае на работу "ў полі", г. зн. на практычнае засваенне навыкаў і ўменняў. Выкладчыкі-практыкі дзейнічаюць у асноўным як супервізары, выконваючы функцыі настаўнікаў-прафесіяналаў. Безумоўна, іх асноўная функцыі — навучальная, педагагічная, аднак перш за ўсё яны — прафесіяналы ў практычнай сацыяльнай рабоце, і іх дзеянні з самага пачатку арыентаваны на сумесную творчасць са студэнтамі, на тое, каб выхаваць у іх любоў да прафесіі, навучыць пераадольваць стрэсавыя сітуацыі, працаваць разам з іншымі ў "камандзе" і не ўхіляцца ад супрацоўніцтва з будучым супервізарам.

Гэты бок супервізарства ў замежнай сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па сацыяльнай рабоце заслугоўвае самай пільнай увагі арганізатараў навучання сацыяльных работнікаў у Беларусі.

На жаль, такі бок прафесійнай сацыяльнай работы, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супервізарства, практычна не распрацаваны ў нашай рэспубліцы. На наш погляд, у бліжэйшы час неабходна:

— па-першае, унесці адпаведныя карэктывы ў штатныя расклады арганізацый у сістэме сацыяльнага абслугования, г. зн. увесці пасаду супервізара;

— па-другое, праз сістэму курсаў пачаць падрыхтоўку такіх спецыялістаў на пачатковым этапе з ліку практыкуючых, найбольш вопытных спецыялістаў на сацыяльнай рабоце, а ў далейшым увесці і адпаведную спецыялізацыю на факультэтах сацыяльнай работы на базе спецыялізацыі па кіраванні.

Несумненна, калі мы звернемся да пазітыўнага сацыяльнага вопыту іншых краін, айчынная сацыяльная работа зможа развівацца больш эфектыўна.

**М.Л.Кузьмініч,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ: ЗМЕСТ, АРГАНІЗАЦЫЯ, ФОРМЫ КАНТРОЛЮ

Педагагічная практыка студэнтаў у Беларускім універсітэце культуры з'яўляецца неад'емнай часай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для сацыякультурнай сферы Беларусі. Яна забяспечвае сувязь паміж тэарэтычным навучаннем і практычным прафесійным станаўленнем.

Змест і арганізацыя педагагічнай практыкі грунтуюцца на прынцыпах навуковага светапогляду і маральнай накіраванасці практыкі; самастойнасці і актыўнасці студэнтаў; сувязі педагагічнай практыкі з тэарэтычнымі курсамі і жыццём; адзінства тэарэтычнай і практычнай, педагагічнай, псіхалагічнай і метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Практыка скіравана на самастойнае пазнанне студэнтамі педагагічных працэсаў і з'яў у навучальных установах культуры і мастацтва; на фарміраванне творчых здольнасцей і